# ЛІТАРАТУРА БЕЛАРУСКАЙ ЭМІГРАЦЫІ Ў МІНСКУ

13 снежня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адкрылася выстаўка літаратуры беларускай эміграцыі са Злучаных Штатаў Амерыкі. Калекцыю кніг, часопісаў (усяго 611 адзінак) перадаў у падарунак бібліятэцы дырэктар Беларускага інстытута навукі і мастацтва ў Нью-Йорку доктар Вітаўт Кіпель у час правядзення I з'езда беларусаў свету.

На выстаўцы будуць прадстаўлены матэрыялы па гісторыі Беларусі, мове, літаратуры, рэлігіі.

Экспазіцыя працягнецца да канца снежня.